**А. Вярбіла**

# ОСТАРБАЙТЭР Ў ДВУХБАКОВЫМ ЛЮСТЭРКУ

У гады Вялікай Айчыннай вайны з Беларусі на тэрыторыю Германіі было вывезена амаль 400 тыс. беларускіх грамадзян, з якіх вярнулася каля адной трэці. Пастанова Савета міністраў па абароне рэйха ад 1942 г. «Аб умовах выкарыстання ўсходніх рабочых» уяўляе сабой бездакорна сфармуляваны працоўны кантракт. Нямецкая бюракратычная машына не пакідае слядоў злачынстваў. Між тым пры параўнанні нямецкіх дакументаў і паказанняў непасрэдных удзельнікау вывазу ў рэйх вымалёўваецца горкая рэчаіснасць умоў існавання нашых землякоў.

«Усходнія рабочыя – працоўная сіла не нямецкага падданства, якая была мабілізавана ў генеральнай акрузе Беларусь, дастаўлена ў германскі рэйх і выкарыстоўваецца тут», – адзначаецца ў вышэйназванай пастанове. Канцэлярызмы «дастаўлены» і «выкарыстоўваюцца» падрабязней тлумачацца ў аповедах былых остарбайтэраў: «транспарціроўка адбывалася ў вагонах-цялятніках без ежы, хлопцы і дзяўчаты разам, у таварных вагонах разам з каровамі, дзе ў кожным з вагонаў было па 20–30 чалавек, у дорогу далі кацялкі для вады і адну буханку хлеба на чатырох, канваір толькі паспяшаў: «Хутчэй у вагоны!».

«Мабілізацыя» адлюстравана словамі: «насільна вывезлі, схапілі, угналі, арыштавалі і адправілі ў лагер, вывезлі невядома куды, пагрузілі і павезлі, пачалі прымусова забіраць праз аблавы, блакады і карныя акцыі, моцна плакалі, а калі заганялі ў вагоны, то брыкаліся, аказваючы супраціўленне. Маці толькі плакала і прасіла: адна яна у мяне, адпусціце».

Важнай з'яўляецца «Памятка для ўсходніх рабочых аб умовах пражывання, працы і побыту ў Германіі» ад 1 красавіка 1942 г., амаль кожны абзац якой шчодра ілюструецца пэўнымі пасведчаннямі: «працавалі па 12 гадзін на фабрыцы пораху пад зямлёй, даілі па 30 кароў у дзень, рабочы дзень складаўся з 12 гадзін, праца па пагрузцы вугля на шахце «Роберт Мюзер» з 5.20 да 17.30, па 12 гадзін на ваенным заводзе, дзе выраблялі дэталі, рабочы дзень цягнуўся з 4 ранку да 8 гадзін вечара». Побыт беларускіх остарбайтэраў забяспечваўся: «баракамі, кратамі, нарамі ў тры ярусы, былі клеткі, від лагера пужаў сваёй агароджай, дротам, ахоўнымі шалёнымі сабакамі, з адзежы выдалі спяцоўку, драўляныя калодкі. Па загаду самі прышылі на рукаве знак «Ост». Пра санапрацоўку знаходзім наступнае: «Нас, паліваючы з-пад шланга вадой, абліваючы спецыфічнымі растворамі, рыхтавалі да новага жыцця, страціла валасы, але атрымала нумар 501».

Сведкі даволі шчодрыя на жудасныя падрабязнасці і эпітэты ў дачыненні да пытання харчавання: «кошык бульбы і хлеб з апілкамі на два дні, кармілі асобна, дрэнна і мала, адходамі – у прадуктах плавалі чэрві; прасілі, каб у суп сыпалі марганцоўку, каб не атруціцца, кармілі жудасна, усялякім гніллём».

Знаёмства з афіцыйнымі нацысцкімі загадамі, пастановамі, зводкамі і параўнанне іх з пасведчаннямі непасрэдных уздельнікаў паказала цынізм і падман, якімі прапітаны гэтыя дакументы.